**Список использованных источников**

1. *Ершова, О. И.* Создание и развитие научно-исследовательского института педагогики в БССР (1929–1941 гг.) / О. И. Ершова // Веснік адукацыі. – 2019. – № 11. – С. 15–22.

2. Положение о научных корреспондентах Научно-исследовательского Института школ Министерства просвещения Белорусской ССР // Белорусский Государственный архив научно-технической документации (БГАНТД). – Ф. 147. Оп. 1. Д. 3. Л. 8.

3. Научно-исследовательский институт педагогики Белорусской ССР (1929–1979) / Министерство просвещения БССР, М. А. Лазарук (отв. ред). – Минск: Народная асвета, 1979. – 78 с.

4. Постановление Совета Министров БССР 14.01.1951 о переименовании Научно-исследовательского института школ в Научно-исследовательский институт педагогики Министерства просвещения БССР // Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 4. Оп. 4. Д. 5. Л. 18–21.

5. Штатное расписание НИИ педагогики Министерства просвещения БССР // БГАНТД. – Ф. 147. Оп. 1. Д. 22. Л. 4–8.

6. Выставка «Народное образование в БССР» в г. Женева (Швейцария) // БГАНТД – Ф. 147. Оп. 1. Д. 125. Л. 270–291.

7. Приказа института № 18 от 02.03.1972 // БГАНТД. – Ф. 147. Оп. 5. Д. 158. Л. 15.

8. Приказ института № 129 от 17 сентября 1973 года // БГАНТД – Ф. 147. Оп. 5. Д. 160. Л. 52.

9. *Гинчук, В. В.* Центр развития педагогической мысли и образовательной практики (к 90-летию Национального института образования) / В. В. Гинчук, О. В. Зеленко, В. Ф. Русецкий // Веснік адукацыі. – 2019. – № 11. – С. 12–18.

**(Дата подачи: 22.02.2024 г.)**

*А. М. Нароўская*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Минск

*A. Narouskaya*
Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk

**УДК 398.34:[001.89:39]**

# МЕТОДЫКА ПАЛЯВЫХ ЭТНАГРАФІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ТРАДЫЦЫЙНАГА ЖЫЛЛЯ БЕЛАРУСАЎ

# METHODOLOGY FOR FIELD ETHNOGRAPHIC RESEARCH OF THE TRADITIONAL DWELLING OF BELARUSIANS

*У артыкуле разглядаецца методыка падрыхтоўкі і правядзення этнаграфічных экспедыцый навуковымі супрацоўнікамі музеяў. Прыводзяцца матэрыялы аб этнаграфічных экспедыцыях на тэрыторыі Беларусі, якія захоўваюцца ў архіве Расійскага этнаграфічнага музея і архіве Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Выяўляецца парадак і сістэма выяўлення традыцыйнага жылля ў час этнаграфічных экспедыцый. Разглядаюцца асноўныя метады, якія выкарыстоўваюць этнографы пры даследаванні традыцыйнага жылля ў час палявых экспедыцый.*

*Ключавыя словы: этнаграфія; методыка; этнаграфічныя экспедыцыі; этнаграфічныя крыніцы; традыцыйные жыллё.*

*The article discusses the methodology for preparing and conducting ethnographic expeditions of museum researchers. The materials of ethnographic expeditions on the territory of Belarus are presented, which are stored in the archives of the Russian Ethnographic Museum and the archives of the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Life. The order and system for identifying traditional housing during ethnographic expeditions is revealed. The main methods used by ethnographers when studying traditional housing during field expeditions are considered.*

*Keywords: ethnography; methodology; ethnographic expeditions; ethnographic sources; traditional dwelling.*

Ператварэнне этнаграфіі ў гістарычную навуку, якая вывучае не толькі асаблівасці жыцця народа, але і заканамернасці гістарычнага развіцця этнасаў, асаблівасці іх культуры і побыту, значна пашырыла ў XIX ст. базу гістарычных крыніц.

Даследчыкі распрацоўваюць новыя прыёмы, метады назіранняў, апрацоўваюць іх вынікі (методыка апісанняў, правілы запісу этнаграфічных матэрыялаў і г. д.). Палявыя матэрыялы становяцца асноўнай крыніцай даследавання традыцыйнай культуры са сваімі метадамі атрымання неабходных звестак.

Пры падрыхтоўцы публікацыі былі выкарыстаны архівы Расійскага этнаграфічнага музея (далей – РЭМ) і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (далей – БДМНАП): палявыя вопісы, дзённікі, справаздачы этнографаў і архітэктараў, а таксама матэрыялы асабістага архіва аўтара. Пры напісанні артыкула былі прааналізаваны даследаванні Г. Г. Громава , С. П. Жлоба, Т. А. Навагродскага, якія прысвяцілі шэраг работ методыцы правядзення этнаграфічных экспедыцый. У працах разглядаюцца асноўныя патрабаванні да навуковай, метадычнай і тэхнічнай падрыхтоўкі экспедыцый, методыка і парадак даследавання, практычныя прыёмы этнаграфічнага вывучэння традыцыйнай культуры і побыту.

Першыя праграмы з метадычнымі распрацоўкамі па даследаванні традыцыйнай культуры з’явіліся яшчэ ў XIX ст. Гэта было выклікана павышаным інтарэсам да гісторыі і культуры свайго народа.

Сістэматычны і мэтанакіраваны збор этнаграфічных матэрыялаў пачынаецца з заснавання ў 1845 г. Рускага геаграфічнага таварыства (далей – РГТ). Дзейнасць таварыства адыграла важную ролю ў вывучэнні культуры і побыту беларусаў. Далейшая актывізацыя дзейнасці РГТ звязана з адкрыццём Паўночна-Заходняга (1867) аддзела гэтага таварыства. У выніку дзякуючы гэтым праграмам і анкетам былі атрыманы шматлікія матэрыялы, у тым ліку па традыцыйнаму жыллю беларусаў.

Перыядычны друк адыграў важную ролю ў папулярызацыі праграм, навуковай методыцы па зборы матэрыялаў. Так, у «Гродзенскіх губернскіх ведамасцях» была надрукавана праграма па зборы этнаграфічных звестак і фальклору Г. Кулжынскага [1].

Цікавасць уяўляе «Кароткая праграма для збірання этнаграфічных прадметаў у Беларусі» А. К. Сержпутоўскага, якая знаходзіцца ў архіве РЭМ [2, арк. 2]. У гэтай праграме даюцца рэкамендацыі па даследаванні беларускага традыцыйнага жылля. Этнограф пералічвае розныя тыпы паселішчаў, віды жылля і гаспадарчых пабудоў, на якія ў час этнаграфічных экспедыцый трэба звярнуць увагу: «…Селішчы: мястэчка, сяло, вёска, выселак, пасёлак, хутар і т. п. Планы вуліц, дарог і размяшчэнне двароў, а таксама гумнаў, стагоў хлеба, сена і саломы. Ізба (хата), святліца, курнік, клець, варыўня, свіран, гумно, хлеў, свінух, загон, паветка, шопа, стадола, курань, склеп… бані (лазні)… веснічкі, завалеі і т. п.» [2, Арк. 5–6].

У праграме А. К. Сержпутоўскі звяртае ўвагу на важнасць выяўлення адметнасцяў беларускага жылля. Этнограф адзначае, што пажадана, па «магчымасці рабіць планы, чарцяжы, мадэлі пабудоў і іншых збудаванняў і даваць самае падрабязнае апісанне з усімі … павер’ямі па выбару месца, способу і тэхніцы ўзвядзення той ці іншай пабудовы». А. К. Сержпутоўскі дае таксама парады па набыцці прадметаў інтэр’еру і ўнутранага ўбрання: павінны быць набыты характэрныя часткі з разьбой, малюнкамі, творамі народнага мастацтва, а таксама прадметы ўнутранага ўбрання хаты і іншых будынкаў [2, арк. 6].

У этнаграфічных справаздачах А. К. Сержпутоўскага, В. К. Косткі і Е. Р. Раманава адзначаецца, што этнографы замаўлялі ў час экспедыцый на Беларусі мадэлі жылых і гаспадарчых пабудоў. У архіве РЭМ ёсць дакументы па замове і вырабе ў мясцовых беларускіх майстроў мадэляў традыцыйнага жылля і гаспадарчых пабудоў. Так, знойдзена заява ў Савет Этнаграфічнага аддзела Рускага музея Імператара Аляксандра III за подпісам В. К. Косткі. У заяве адзначаецца, што падчас камандзіроўкі ў Мінскую губерню ў 1905 г. была замоўлена мадэль сялянскага дома столяру ў 1/10 натуральнай велічыні [3, арк. 39].

Беларускі этнограф Е. Р. Раманаў, які супрацоўнічаў з Этнаграфічным аддзелам Рускага музея (з 1902 па 1910 г.), таксама перадаў музею серыю мадэляў жылля, гаспадарчых і вытворчых будынкаў [4, арк. 1]. Мадэлі не захаваліся, але іх падрабязнае апісанне ўяўляе пэўную навуковую каштоўнасць. Аўтар дае падрабязнае апісанне сялянскага двара Сенненскага павета Магілёўскай губерні. У справе 676 адзначаецца, што Е. Р. Раманаў набыў за сродкі Этнаграфічнага аддзела (1906 г.) мадэль сялянскага двара з в. Кішкі Сенненскага павета Магілёўскай губерні Этнограф дае падрабязнае апісанне жылога памяшкання і яго канструктыўных дэталяў: «Хата пабудавана з круглага хваёвага бярвення. Бярвенне ссечана ў простыя вуглы і шчыльна прыгнана адно да другога, а шчыліны паміж імі заканапачаны мохам. Столь з дошак, пакладзеных на бэлькі. Дзверы адчыняюцца ў сенцы. Тры вакны: адно на вуліцу, а два ў панадворак. Вокны затуляюцца саламянымі матамі. Коміна няма, а дым з печы выходзіць у адчыненыя дзверы ці зробленую ў столі адтуліну. Такую хату завуць “курною”».

Па словах навуковых супрацоўнікаў аддзела этнаграфіі Усходняй, Паўднёва-Усходняй і Цэнтральнай Еўропы РЭМ, мадэлі жылых і гаспадарчых пабудоў не захаваліся ў сувязі з павадкам, які быў у 1920-х гг., і Другой сусветнай вайной.

У 1930-х гг. збіральніцкая дзейнасць навуковых супрацоўнікаў РЭМ у Беларусі прыпынілася. Этнаграфічныя экспедыцыі аднавіліся ў 1960–1980-я гг. і спыніліся на пачатку 1990-х гг. у сувязі з распадам СССР.

Асабліва актуальнай для беларускіх этнографаў стала авалоданне методыкай па збору этнаграфічных прадметаў пасля 9 снежня 1976 г., калі Савет Міністраў БССР прыняў Пастанову аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Была створана Рабочая група па стварэнні Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, у склад якой увайшлі архітэктары і этнографы. Ужо ў 1977 г. навуковыя супрацоўнікі будучага музея пачалі актыўна прымаць удзел у этнаграфічных экспедыцыях, аб чым сведчаць архіўныя матэрыялы музея [5].

Для ўкамплектавання музея патрабавалася некалькі дзясяткаў тысяч разнастайных музейных прадметаў, а таксама сотні жылых і гаспадарчых пабудоў для стварэння экспазіцыі музея пад адкрытым небам.

Сектар этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР актыўна супрацоўнічаў з музеем пад адкрытым небам. Навуковыя супрацоўнікі сектара этнаграфіі распрацавалі методыку выяўлення, апісання і збірання помнікаў этнаграфіі [6]. Даследчыкамі сектара У. С. Гурковым. С. Ф. Цярохіным і дырэктарам музея, архітэктарам С. А. Сергачовым былі вылучаны асноўныя крытэрыі, якімі трэба было кіравацца пры выбары жылой ці гаспадарчай пабудовы для будучага музея. Былі прапанаваны наступныя метадычныя парады: звяртаць увагу на тыповасць архітэктурных пабудоў для дадзенай мясцовасці, разам з тым неабходна было памятаць, што чым больш старажытны музейны аб'ект ці прадмет, тым больш каштоўны ён для музея і навукі.

Навуковым супрацоўнікам сектара этнаграфіі ІМЭФ В. С. Цітовым была распрацавана канцэпцыя гісторыка-этнаграфічнага раяніравання матэрыяльнай культуры на тэрыторыі Беларусі [7]. Было вылучана 6 гісторыка-этнаграфічных рэгіёну: Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Падняпроўе, Паазер'е, Заходняе і Усходняе Палессе. Пры правядзенні этнаграфічных экспедыцый навуковыя супрацоўнікі музея пад адкрытым небам праводзілі даследаванне помнікаў драўлянай архітэктуры і збор музейных прадметаў згодна з выдзеленымі рэгіёнамі.

Асноўнай структурна-планіровачнай адзінкай музея павінна была стаць сялянская сядзіба з традыцыйным комплексам жылых і гаспадарчых пабудоў, інтэр'еры неабходна было абсталяваць усімі неабходнымі прадметамі хатняга ўжытку канца XIX – пачатку XX ст.

Для выканання пастаўленай задачы па збору інфармацыі аб традыцыйным жыллі і гаспадарчых пабудовах кіраўніцтвам музея былі арганізаваны сотні этнаграфічных экспедыцый ва ўсе вылучаныя рэгіёны краіны.

Пры вывучэнні жылля найбольш прымяняліся маршрутныя экспедыцыі. Такія экспедыцыі дазвалялі ахапіць абследаваннем вялікую колькасць вёсак і правесці масавае выяўленне традыцыйных пабудоў. Напрыклад, у справаздачы аб экспедыцыі ў Шчучынскі і Мастоўскі раёны Гродзенскай вобласці (11.10. – 22.10. 1979 г.) адзначаецца, што за гэты перыяд было абследавана 53 вёскі [8, арк. 71].

Вывучэнне жылля і гаспадарчых пабудоў, згодна з прапанаванай методыкай, трэба было пачынаць з вызначэння жылога комплексу. Каб сабраць пра яго найбольш поўныя звесткі, архітэктары і этнографы выкарыстоўвалі адначасова некалькіх відаў палявой работы: апытанне насельніцтва, апісанне жылля, фотаздымкі, абмеры пабудоў і вычэрчванне іх планаў, замалёўкі і капіраванне архітэктурных упрыгожванняў.

Палявая праца ў этнаграфічнай экспедыцыі заўсёды вельмі разнастайная. У адзін і той жа дзень этнографу нярэдка даводзіцца проста разглядаць і выбіраць жылыя альбо гаспадарчыя пабудовы, якія, на яго думку, найбольш тыповыя для арэала даследавання, браць інтэрв’ю, гутарыць з мясцовымі жыхарамі і фатаграфаваць, апісваць тыя ці іншыя з’явы, замалёўваць разнастайныя прадметы і да г. д.

Такім чынам, у ходзе экспедыцый этнографы прымянялі наступныя метады даследавання: 1) назіранне; 2) апытанне, інтэрв’ю, анкетаванне; 3) выяўленне і фіксацыя рэчавых крыніц; 4) выяўленне і апрацоўка дакументальных матэрыялаў. Вынікі назіранняў этнографы фіксуюць у палявым дзённіку ў форме апісання ўбачанага. Для фіксацыі назіраемых з’яў даследчыкі вельмі часта выкарыстоўвалі фотаапараты.

Пры правядзенні даследавання этнографу неабходна дакладна сфармуляваць мэту апытання, правільна выбраць інфарматараў. Для гэтага існуе мноства крытэрыяў, абумоўленых тэматыкай даследавання: этнічная і канфесійная прыналежнасць, узрост (год нараджэння), месца нараджэння, пол, адукацыя, прафесія і інш. Для традыцыйных этнаграфічных тэм, напрыклад, такіх як жыллё, будаўнічая абраднасць, важнае значэнне маюць узрост, пол і этнічная прыналежнасць.

Як паказаў аналіз справаздач, што захоўваюцца ў архіве музея пад адкрытым небам, усе жылыя і гаспадарчыя помнікі маюць анатацыі – кароткае апісанне, звесткі аб паходжанні, выкарыстанні, канструкцыях і выглядзе. Пры афармленні анатацыі навуковыя супрацоўнікі музея, згодна з распрацаванай методыкай, праводзілі апытанне па наступных пунктах: 1) вёска альбо іншае паселішча; 2) прадмет даследавання; 3) уладальнік дома альбо прадмета; 4) час вырабу; 5) кім зроблены; 6) матэрыял, з якога зроблены прадмет; 8) форма; 9) спосаб і тэхніка вырабу і інш. [6, с. 5].

Пры даследаванні традыцыйнага жылля архітэктары і этнографы ўдзялялі ўвагу наступным асаблівасцям традыцыйных забудоў: 1) двор з пабудовамі абапал вуліцы ці аднарадная забудова; 2) аднакамернае, двух- ці трохкамернае жыллё; 3) канструкцыі; 5) фундамент; 6) вугал у чашку, просты замок ці ў каню; 9) форма страхі; 10) пакрыццё страхі: салома, дран-

ка, гонт, дошкі; 11) форма вільчыка; 12) франтон; 13) вокны; 14) дзверы. Дадатковую інфармацыю аб архітэктурных аб’ектах, канструктыўных дэталях і этнаграфічных прадметах можна ўбачыць у фатаздымках, малюнках і чарцяжах, якія прыкладаюцца да справаздач.

Як ужо адзначалася, асноўным крытэрыем, якім кіраваліся даследчыкі пры выбары аб’екта, была тыповасць. Кожная жылая ці гаспадарчая пабудова, якая была тыповай, гэты значыць мела шэраг характэрных канструктыўна-будаўнічых асаблівасцей для арэала ці рэгіёна, скрупулёзна даследавалася і вылучалася. Напрыклад, у Пінскім, Іванаўскім, Столінскім раёнах Брэсцкай вобласці больш распаўсюджана двухкамерная хата (хата + сенцы), а значыць, яна больш тыповая [9, арк. 50]. У іншых раёнах больш распаўсюджана трохкамерная хата (хата + сенцы + камора або хата + сенцы + хата).

Асобую ўвагу даследчкі звярталі на вывучэнне планіроўкі двара. Пры гэтым абмяжоўваліся складаннем прыкладнай схемы размяшчэння пабудоў на двары, але найчасцей складалі дакладны план усяго двара, вымяраючы адлегласць паміж пабудовамі і памеры саміх пабудоў з дапамогай рулеткі. Як паказалі даследаванні, планіроўкі сядзібы і планіроўкі вёсак мелі як агульныя рысы, так і рэгіянальныя асаблівасці. Напрыклад, у справаздачы аб экспедыцыі ў Гомельскую вобласць (Рэчыцкі, Гомельскі, Буда-Кашалеўскі, Веткаўскі, Добрушскі раёны) адзначаецца, што для даследуемых раёнаў характэрны замкнёны двор з варотамі і стрэшкай на іх [10, арк. 27]. У справаздачы аб экспедыцыі ў Нараўлянскі, Брагінскі, Хойніцкі раёны Гомельскай вобласці (1978 г.) адзначаецца, што для гэтых раёнаў характэрна планіроўка сядзіб з незвязанымі пабудова, больш рэдка сустракаюцца невялікія пагонныя двары [11, арк. 7]. У той час як у в. Амговічы і в. Сарогі Слуцкага раёна Мінскай вобласці характэрным быў пагонны тып забудовы.

У час экспедыцый вызначалася месца размяшчэння сялянскага двара ў селішчы: высвятлялася, як зарыентавана пабудова па баках свету, да вуліцы ці да ракі. Напрыклад, у справаздачы аб экспедыцыі ў Іўеўскі раён Гродзенскай вобласці адзначаецца, што «хаты выходзяць на вуліцу, як у мястэчку. Забудова вулічная, двухрадная, шчыльная. Хаты стаяць адна каля другой» [12, арк. 57 адв.]. У в. Пагост Жыткавіцкага раёна сустракаецца аднарадная забудова жылля ўздоўж рэчкі.

Пры даследаванні жылля, па магчымасці, выяўлялі сацыяльнае становішча яго жыхароў. Так, напрыклад, у час этнаграфічнай экспедыцыі ў в. Мохры Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці (1978 г.) зафіксавана былое жыллё мясцовага войта (хата + сені + хата). На дзень экспедыцыі засталася толькі хата + сені, а другая хата пры падзеле маёмасці паміж братамі перанесена ў іншае месца [9, арк. 49]. Адзначаецца, што абмер і складанне планаў – асноўны прыём фіксацыі матэрыялаў па жыллі. На гэтым плане прастаўляюцца звесткі аб гаспадарах жылля, аб часе яго ўзвядзення, якія праводзіліся пераробкі, запісваюцца назвы асобных частак і г. д.

Упрыгожванні жылля фіксуюць асобна. Адзначаюць месцы іх размяшчэння, характар, кім выкананы і як, якой тэхнікай. Разьбяныя ўпрыгожванні фатаграфуюць або змалёўваюць. Так, у справаздачы аб экспедыцыі ў Гомельскі раён (1979 г.) адзначаецца, што ёсць вёскі, у якіх хаты з разьбянымі ліштвамі на вокнах і па франтону. Асабліва адзначаюцца в. Рудня Целяшкоўскага с/с і в. Цыкуны Бабавіцкага с/с Гомельскага раёна. Да справаздачы прыкладаюцца фотаздымкі жылля, фасадаў, ліштваў [13, арк. 2].

Мэбля звычайна на планах не адзначаецца, калі толькі яна не з'яўляецца часткай пабудовы. Аднак, калі гэта неабходна, на плане можна паказаць размяшчэнне мэблі, карыстаючыся ўмоўнымі пазначэннямі. Іншыя асаблівасці інтэр'еру паказваюцца ў апісанні або фіксуюцца на фотаздымках. Напрыклад, у справаздачы аб камандзіроўцы ў Брэсцкую вобласць адзначаецца, што ў Махнюк Вольгі Фёдараўны (в. Марозавічы, Пінскі раён Брэсцкай вобласці) зафіксаваны «куфар сіняга колеру з двума мядзведзямі». А ў Кудзеліч Валянціны Сямёнаўны (в. Марозавічы) знаходзіцца «кованы куфар (канец XIX ст.)» [9, арк. 51], а «ў хаце Аўдзейчука Навума Ігнатавіча знаходзіцца куфар на чатырох ножках» (в. Хойна, Пінскі раён) [9, арк. 54]. Для фатаграфавання інтэр'еру карыстаюцца адмысловымі шырокавугольнымі аб'ектывамі ці робяць «панарамны» здымак звычайным аб'ектывам.

Як і ўсякі іншы элемент традыцыйнай культуры, жыллё вывучаюць у яго развіцці. Безумоўна, у час экспедыцый трэба вызначыць узрост пабудовы. Звычайна гэта ўдаецца зрабіць па матэрыялах роспытаў або па афіцыйных дакументах. Так, у экспедыцыі ў в. Амговічы Слуцкага раёна быў зафіксаваны жылы дом Стром Арыны Фёдараўны 1899 г. Аб гэтым сведчыць надпіс пад бэлькай «1899 год. Намаляваны крыж 23 марта» – дата асвяшчэння жылля.

Этнограф заўсёды павінен мець на ўвазе, што больш архаічныя будаўнічыя прыёмы ўжываюцца пры збудаванні будынкаў і пабудоў часавага характару або дапаможных памяшканняў (будуюць буданы, курныя хаткі, лазні), якія выйшлі з ужытку.

Выбар будаўнічых матэрыялаў і само будаўніцтва ў значнай ступені залежаць ад геаграфічных умоў. У цеснай залежнасці ад матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца ў будаўніцтве, знаходзіцца і канструкцыя пабудоў. Так, у лясной зоне распаўсюджаны зрубныя пабудовы. Знаёмячыся з будаўнічымі матэрыяламі, этнограф павінен апісаць спосабы іх здабычы і падрыхтоўкі, зафіксаваць цікавыя прыклады, прылады, з дапамогай якіх нарыхтоўваюць гэтыя матэрыялы. Канструкцыі жылля фіксуюць, робячы маштабныя абмеры і складаючы чарцяжы, фатаграфуючы стадыі ўзвядзення пабудовы.

Апісанне канструкцый пабудоў, згодна з методыкай даследавання, лепш весці адначасова, напрыклад, знізу ўверх, гэта значыць пачынаючы з будаўніцтва падмурка і заканчваючы ўладкаваннем даху. Напрыклад, у справаздачы аб экспедыцыі ў Зельвенскі раён Гродзенскай вобласці адзнача-

ецца, што ў в. Падбалоцце Зельвенскага раёна быў зафіксаваны жылы дом на сохах, які належыў Ю. П. Грышкевічу [14, арк. 65].

Калі вывучаецца гісторыя жылля, асаблівую ўвагу звяртаюць на абрады і павер'і, якія з ім звязаны. Напрыклад, у час экспедыцыі ў в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці інфарматар Панчэня Кацярыны Аляксееўны (1941 г. н.) распавяла аб мясцовых будаўнічых абрадах: «лепш было будаваць хату на бацькоўскім пляцы». Былі атрыманы цікавыя звесткі і аб пераходзінах («улазінах») у новы дом. Паводле звестак інфарматара (Кузьміч Марыі Дзмітрыеўны, жыхаркі в. Пагост, 1944 г. н.), перш чым перайсці ў новую хату, «пускалі ката, які быў у хазяйстве». Па словах К. А. Панчэні, «пускалі трохмасцівага ката. А калі не было ката такой масці, то пускалі іншага, але толькі "свайго" ката, бо ён сем'янін») [15].

У час экспедыцый фіксуюцца ўсе звесткі, звязаныя з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі. Так, у в. Мохра Іванаўскага раёна праўнук уладара дома перадаў музею ў дар манету 1861 г., якая была закладзена на покуці «ў чырвоны кут» гэтай хаты. Асобныя моманты будаўнічых прац нярэдка суправаджаюцца адмысловымі абрадамі. Матэрыялы аб гэтым, як і тэрміналогія элементаў жылля, могуць паказваць шмат цікавага аб мінулым прызначэнні асобных частак жылля, мінулай планіроўкі і г. д.

Такім чынам, асноўнымі фактычнымі дадзенымі па традыцыйнаму жыллю беларусаў з'яўляліся на ўсіх этапах яго вывучэння палявыя этнаграфічныя матэрыялы. Палявая праца для этнографа – важнейшы шлях атрымання першаснай інфармацыі аб культуры этнаса і адзін з асноўных спосабаў камплектавання музейнага збору. Асноўнымі метадамі работы этнографа з'яўляюцца назіранне, апытанне, інтэрв'ю, фатаграфаванне, замалёўкі. Звесткі, атрыманыя ва ўмовах непасрэднага кантакту этнографа з вывучаемым народам, заўсёды будуць больш рэпрэзентатыўнымі, чым тыя, якія даследчык атрымлівае з пісьмовых або выяўленчых крыніц.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Кулжинский, Г.* Об этнографических сведениях касательно Западной России / Г. Кулжинский // Гродненские губернские ведомости. – 1866. – № 41; 1867. – № 21.

2. Архіў Расійскага этнаграфічнага музея (далей – АРЭМ). – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 573.

3. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 351.

4. АРЭМ. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 547.

5. Архіў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (далей – БДМНАП). – Справаздача аб экспедыцыі ў Магілёўскую, Віцебскую і Мінскую вобласці (перыяд 20.09 – 05.10.1977).

6. Помнікі этнаграфіі: Методыка выяўлення, апісання і збірання / Беларус. Добраахвот. Т-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры. Сектар этнаграфіі Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР; пад рэд. В. К. Бандарчыка. – Мінск: Навука і тэхніка. – 150 с.

7. *Титов, В. С.* Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов: XIX – начало XX в. / В. С. Титов. – Минск: Наука и техника, 1983. – 152 с.

8. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па РБ (24.08–30.11.1979 г.). – Справаздача аб камандзіроўцы ў Шчучынскі і Мастоўскі раёны Гродзенскай вобласці (11.10–22.1.1979 г.).

9. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па РБ (14.01–27.05.1978). – Справаздача ў Брэсцкую вобласць, Пінскі, Іванаўскі і Столінскі раёны 27.03–01.04.1978. Арк. 50.

10. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па РБ (14.01 – 27.05.1978). – Справаздача аб камандзіроўцы ў Гомельскую вобласць (13.03 –18.03.1978).

11. Архіў БДМНАП. – Справаздачы ў навуковыя камандзіроўкі (10.07–05.08.1978 г.). – Справаздача ў Гомельскую вобласць Нараўлянскі, Брагінскі, Хойніцкі раёны (04.07–10.07.1978 г.).

12. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па РБ (31.03–28.04.1979 г.). – Справаздача аб камандзіроўцы ў Іўеўскі раён Гродзенскай вобласць (23.04–29.04.1979 г.).

13. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па РБ (22.01–03.02.1979 г.). – Этнаграфічная справаздача аб камандзіроўцы ў Гомельскі раён Гомельскай вобл. (22.01–27.01.1979 г.).

14. Архіў БДМНАП. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па РБ (22.01–03.02.1979 г.). – Справаздача аб камандзіроўцы ў Зельвенскі раён Гродзенскай вобласці (29.01–03.02.1979 г.).

15. Асабісты архіў аўтара. – Экспедыцыя ў в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. – 2024.

**(Дата падачы: 12.02.2024 г.)**

*Ф. А. Некрашевич*
Академия МВД Республики Беларусь, Минск

*P. Nekrashevich*
Academy of the MIA of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 947 “1794/1874”**

## РЕКРУТСКАЯ ПОВИННОСТЬ КАК НАКАЗАНИЕ В БОРЬБЕ С ПРЕСТУПЛЕНИЯМИ, СВЯЗАННЫМИ С ПОХИЩЕНИЕМ ЧУЖОГО ИМУЩЕСТВА, В БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ РОССИЙСКОЙ ИМПЕРИИ (1794–1874 ГГ.)

## RECRUITMENT AS A PUNISHMENT IN THE FIGHT AGAINST CRIMES RELATED TO THE THEFT OF SOMEONE ELSE’S PROPERTY IN THE BELARUSIAN GOVERNORATES OF THE RUSSIAN EMPIRE (1794–1874)

*В Российской империи служба в вооруженных силах использовалась в качестве наказания за совершение целого ряда преступлений. К ним относилась группа преступлений, связанная с похищением чужого имущества. На протяжении 1794–1874 гг. политика*